# Нaперадзе кітайцаў і на адным узроўні з еўрапейцамі



Трубапракатны цэх.

**У самай сярэдзіне спякотнага лета сваё прафесійнае свята адзначаюць прадстаўнікі, бадай, самай «спякотнай» на свеце прафесіі — металургі. А ў Жлобіне гэтае свята можна лічыць і днём горада. Бо Беларускі металургічны завод — прадпрыемства, на якім працуе кожны шосты жыхар. Да свята тут рыхтуюцца рознабакова, і сёлета пачалі з арганізацыі міжнароднай навукова-тэхнічнай канферэнцыі «Метал-2011», у якой узялі ўдзел прадстаўнікі не толькі блізкага, але і далёкага замежжа: 40 гасцей з Расіі, Украіны, Латвіі, Вялікабрытаніі, а таксама каля 100 мясцовых прадпрыемстваў. Сваіх удзельнікаў вызначалі сярод самых актыўных маладых працаўнікоў завода на папярэдняй унутрызаводскай навукова-тэхнічнай канферэнцыі. З аднаго боку, гэтая канферэнцыя стала своеасаблівым аглядам інтэлектуальнага патэнцыялу моладзі — флагмана айчыннай металургіі, а з іншага — былі адабраны лепшыя работы, прадстаўленыя на міжнародным форуме.**



## РУП «Беларускі металургічны завод»: КУРС НА ЭКСПАРТ

Сяргей Галушкоў тры гады працуе слесарам-рамонтнікам па абслугоўванні сетак вентыляцыі і кандыцыянавання пасля заканчэння ўніверсітэта імя Сухога. Гаворыць, што працаваць вельмі цікава і прасторы для творчага ўвасаблення — бясконцыя. На міжнародную навукова-тэхнічную канферэнцыю прадставіў сваю распрацоўку выкарыстання тэхналогіі «свабоднага ахаладжвання» ў межах энергазберагальнай праграмы на РУП БМЗ:

— Складана змагацца з вядомымі даследчымі цэнтрамі па гэтым накірунку. Мы працуем па ўдасканальванні і ўкараненні іх абсталявання ва ўмовах нашага завода. Мая апошняя распрацоўка прысвечана энергазберажэнню. Размова ідзе аб мадэрнізацыі абсталявання з прымяненнем сучасных тэхналогій для энергазберажэння. Эфект, які чакаецца ад укаранення такой тэхналогіі, — у павелічэнні холадапрадукцыйнасці абсталявання, зніжэнні затрат на электраэнергію, павелічэнні тэрміну службы кампрэсараў халадзільных машын і павышэнні надзейнасці іх работы.

**БМЗ і «Michelin» маюць намер развіваць доўгатэрміновае супрацоўніцтва. Гэтаму спрыялі рашэнні, прынятыя падчас візіту групы «Michelin» на Беларускі металургічны завод. За апошні год для найбуйнейшага ў свеце вытворцы шын завод вырабіў 17 тысяч тон металакорду, што склала 17% ад агульных паставак, і 6 тысяч тон (20%) бартавога дроту. Сёння «Michelin» з'яўляецца для БМЗ другім па аб'ёмах паставак еўрапейскім спажыўцом прадукцыі. У наступным годзе БМЗ і «Michelin» рыхтуюцца адзначыць 10 гадоў свайго супрацоўніцтва. Не выключана, што да гэтай даты паміж імі будзе складзены доўгатэрміновы кантракт тэрмінам на 5 гадоў.**

Маладыя людзі на канферэнцыі абмяркоўвалі магчымасці сталеплавільнай, пракатнай, метызнай вытворчасцяў, метады кантролю тэхналогіі і якасці прадукцыі, новыя інфармацыйныя тэхналогіі, сучасныя падыходы ў энергазахаванні і экалогіі; падзяліліся досведам кіравання, арганізацыяй планавання і іншымі цікавымі ідэямі. Плённа працавалі 11 секцый. Навукова-тэхнічная канферэнцыя «Метал-2011» дазволіла раскрыць творчы патэнцыял маладых працаўнікоў, іх уменне і жаданне працаваць ва ўмовах тэхнічнага прагрэсу, сталага абнаўлення вытворчасці. А камісіі вызначылі пераможцаў: па навізне, эканамічным эфекце, актыўным удзеле, і сёлета ўпершыню — за навуковы дэбют.



Генеральны дырэктар РУП БМЗ Анатоль САВЯНОК.

Генеральны дырэктар Беларускага металургічнага завода Анатоль Савянок падкрэслівае, што на маладых — асаблівыя надзеі, і ім даюцца ўсе магчымасці, каб максімальна праявіць свае творчыя здольнасці:

***— На БМЗ заўсёды падтрымліваюцца маладыя спецыялісты, мы стварылі даследчы цэнтр, дзе маладыя прапаноўваюць свае ідэі. Усе, хто прымае ўдзел у канферэнцыі, працягваюць удасканальвацца, вучыцца. Канферэнцыя стымулюе спецыялістаў да творчасці, у іх ёсць магчымасць паказаць сябе як кіраўніка, высакакласнага спецыяліста. Важна, каб чалавека заўважылі і дапамаглі рухацца далей па кар'ернай лесвіцы.***

На прадпрыемстве кажуць: шлях на завод пачынаецца з дзіцячага садка. І ў гэтым жарце — толькі доля жарту. Бо, сапраўды, усе 9 садкоў з'яўляюцца структурнымі падраздзяленнямі БМЗ і клопат пра іх практычна такі ж, як і пра асноўную вытворчасць, — заўважае **намеснік генеральнага дырэктара РУП БМЗ Уладзімір ФЛАРЫЗЯК:**

— У нас з дзіцячага садка малыя лічаць сябе металургамі. Апошні конкурс, які мы правялі сёлета, — конкурс дзіцячага малюнка «Хачу быць металургам». Плануем выпусціць каляндар на 2012 год з лепшымі працамі. У нас ёсць яшчэ і падшэфная школа.

Хутка дзеці падрастуць, побач са сваімі бацькамі стануць яшчэ адным звяном працоўнай дынастыі металургаў. Для жыхароў Жлобіна самы просты шлях трапіць на прадпрыемства — гэта закончыць мясцовы металургічны тэхнікум. Анатоль Мікалаевіч Савянок з гонарам расказвае пра тое, што сёлета было ўручана 99 дыпломаў выпускнікам установы і ўсе яны гарантавана будуць забяспечаны працай на прадпрыемстве:



Начальнік бюро па тэхналогіі і якасці СтПЦ-2 Алена ШЫМАНОЎСКАЯ.

— Частка пойдзе вучыцца далей, у ВНУ. Мы праводзім прафесійную арыентацыю, і дзеці разважаюць, якія спецыяльнасці выбраць, каб быць запатрабаванымі на нашай вытворчасці. Таму і конкурс у металургічны тэхнікум штогод складае больш чым 2 чалавекі на месца. Для таго, каб набыць пэўную спецыяльнасць у металургіі, у нас ёсць вучэбны цэнтр. Арганізуюцца курсы розных напрамкаў — напрыклад, машыністаў па навіўцы канатаў, электрагазазваршчыкаў... Людзі плацяць грошы, займаюцца, каб трапіць працаваць да нас, на БМЗ. Будучых кіраўнікоў мы вызначаем менавіта сярод маладых. Малады спецыяліст мае магчымасць паказаць сябе. Многія распрацоўкі маладых укараняюцца на практыцы. Сярод рабочых вітаецца рацыяналізацыя, удзел у мерапрыемствах па энергазберажэнні, конкурсах «Лепшы па прафесіі». Два разы на год мы падводзім вынікі працы, і спецыялістам прысвойваецца пэўны клас. За другі клас — 5 % надбаўка да кантракта, за першы — 10 %. Нашы супрацоўнікі ўдзельнічаюць у самых розных конкурсах прафтэхмайстэрства — і абласных, і рэспубліканскіх. Калектыў калісьці фарміраваўся з моладзі, і сёння моладзь складае



Выплаўка сталі ў дугавой сталеплавільнай печы.

вялікую частку працаўнікоў нашага завода.

**На прэс-канферэнцыі кіраўніцтва завода — гіганта беларускай металургіі, якая прайшла напярэдадні прафесійнага свята, журналісты цікавіліся самымі рознымі бакамі жыцця БМЗ. У тым ліку, як валютны крызіс адбіўся на дзейнасці прадпрыемства. Генеральны дырэктар Анатоль Савянок гаворыць, што іх гэтыя працэсы асабліва не кранулі:**

— Асноўная прадукцыя ў нас рэалізуецца на экспарт, мы маем валютную выручку. Паводле аператыўнай інфармацыі, ужо сёлета адправілі на экспарт прадукцыі на $735 млн. Хоць прадпрыемству даводзіцца шмат сыравіны купляць за валюту, у тым ліку і металалом. Мы заўсёды выконвалі абавязковы 30-працэнтны продаж валюты. Астатняе ішло на папаўненне абаротных сродкаў і забеспячэнне сыравінай. Летась мы рэалізавалі прадукцыі на $1,5 млрд і ўжо за 6 месяцаў перасягнулі $1 млрд. За год аб'ём продажаў Беларускага металургічнага завода павінен скласці не менш чым два мільярды долараў.

**13 красавіка 2011 года ў Еўрапейскай штаб-кватэры карпарацыі Eaton Hidraulics (Morgen — Швейцарыя) адбыліся міжнародная канферэнцыя яе пастаўшчыкоў і афіцыйная цырымонія ўзнагароджання «Лепшы пастаўшчык-2010». Сярод больш чым 1000 пастаўшчыкоў званне «Лепшы пастаўшчык-2010» у сектары гідраўлікі прысуджана Беларускаму металургічнаму заводу і кампаніям Belmet (Аўстрыя) і BKS (ЗША). Высокая якасць прадукцыі, лагістыка паставак і аператыўнае рэагаванне на запыты спажыўца дазволіла Eaton прызнаць БМЗ надзейным, стратэгічным партнёрам.**

Завод наш унікальны. На 180 га плошчы сумешчана некалькі вытворчых металургічных вытворчасцяў: будаўнічай арматуры, сыравіны і камплектуючых для машынабудавання, аўтамабільнай прамысловасці, труб для здабычы нафты... Станоўчае гандлёвае сальда — больш за $260 млн, аб'ём жа выплаўкі сталі ўжо за першае паўгоддзе склаў больш 1300 тысяч тон.

Валютны крызіс не паўплываў на колькасць ахвотнікаў набыць прадукцыю завода. Летась яна знаходзіла пакупнікоў у 71 краіне свету. Арматура вытворчасці БМЗ ёсць у падмурку алімпійскага стадыёна ў Лондане, яна ж пастаўляецца на будаўніцтва алімпійскіх аб'ектаў у Сочы і выкарыстоўваецца пры будаўніцтве аднаго з энергаблокаў расійскай атамнай электрастанцыі. Мы падтрымліваем узаемаадносіны з тымі партнёрамі, якія ўжо ёсць. Аднак палітычныя падзеі ў шэрагу краін Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі зрушылі акцэнты. Некаторыя праблемы ўзніклі ў Тунісе, Егіпце, Лівіі, Сірыі... Мы пераразмеркавалі аб'ёмы нашай прадукцыі ў іншыя рэгіёны, у тым ліку ў Венесуэлу. Пачалі сёлета пастаўкі ў Албанію, Швейцарыю, Македонію. Стала больш запатрабавана наша прадукцыя і ў Расіі. Гэтая краіна на першым месцы па аб'ёмах спажывання прадукцыі БМЗ. На другім месцы — Латвія, на трэцім — Германія, а потым ідуць Італія, Ліван, Літва...



Аператары паста кіравання трубапракатнага цэха за працай.

***— Спецыялісты, якія ацэньваюць магчымасці збору металалому (асноўнай сыравіны для БМЗ) на тэрыторыі Беларусі, лічаць, што ў краіне штогод яго можна нарыхтоўваць значна больш, чым зараз, — калі правільна арганізаваць гэтую працу. Ці адбываюцца змены ў станоўчы бок у гэтым напрамку?***

— На прадпрыемстве выкарыстоўваецца 41-42 % беларускага металалому. 58 % яго мы завозім з Расійскай Федэрацыі і Прыбалтыкі. Таму можна казаць, што ў нас тут ёсць вялікія нявыкарыстаныя рэзервы. Але ж трэба адзначыць пазітыўную работу «Белдругмета» і «Белкаапсаюза». Цяпер уведзена аплата за металалом у залежнасці ад катэгорыі. Гэта садзейнічае паляпшэнню сітуацыі са здачай металалому. «Белдругмет» зрабіў перасоўныя атрады, якія ездзяць па вёсках і збіраюць металалом у насельніцтва. Так што прырост збору беларускага металалому за год ёсць. Што тычыцца праблем, абвастрыліся складанасці з адгрузкамі прадукцыі чыгуначным транспартам. На жаль, значная частка рухомага саставу выведзена з карыстання, а новы не ўведзены. Мы стварылі аддзел лагістыкі чыгуначнага транспарту і карыстаемся для перавозкі прыватнымі вагонамі, але іх катастрафічна не хапае.

**27 мая 2011 года ў Мінску адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу «Лепшы экспарцёр 2010 года», які быў арганізаваны Беларускай гандлёва-прамысловай палатай. У намінацыі «Металургія» перамогу атрымала РУП «Беларускі металургічны завод».**

***— Якія мэты акцыянавання БМЗ? Вядома, яно павінна завяршыцца да новага года.***

— Так, стварэнне ААТ дазволіць прыцягнуць інвестыцыі для развіцця за кошт продажу часткі акцый. Дарэчы, сёння рынкавы кошт БМЗ складае $8 млрд. Зараз на прадпрыемстве рэалізуецца інвестыцыйная праграма. У яе ўваходзяць розныя па ўзроўні складанасці праекты. Будаўніцтва новага сортапракатнага стана — самы буйны праект, які знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі, — гэта больш за 100 млн еўра. Што тычыцца стварэння на БМЗ новай лістапракатнай вытворчасці, трэба канчаткова вырашыць фінансавыя пытанні з кампаніяй «Danieli». Таму на ўзроўні першага віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі было прынята рашэнне адпрацаваць яшчэ некалькі варыянтаў, каб мець гарантыі поўнай рэалізацыі гэтага праекта. Размова ідзе аб суме не менш за 800 млн еўра.

Плануецца пабудаваць вытворчасць фінішнай апрацоўкі труб для газа- і нафтаздабычы. Асноўная частка інвестыцый ідзе на развіццё вытворчасці, мадэрнізацыю, арганізацыю новых і пашырэнне нашых магутнасцяў. І яшчэ адна тэма — экалагічная. Мы заключылі кантракт з фінскай кампаніяй «Water Group». Тэрміны яго рэалізацыі — канец гэтага года. Адначасова праводзім рэканструкцыю сталеплавільнай печы №1. Рэалізацыя праекта нам дазволіць палепшыць экалагічную сітуацыю. Плюс да таго, будзем мець дадатковыя аб'ёмы пары. З перспектывай на тое, што яна можа быць выкарыстана для вытворчасці электраэнергіі. Сёлета ўводзім у строй вапнавую печ. Гэты праект дазволіць зэканоміць на выплаўцы і павялічыць аб'ёмы вытворчасці вадкай сталі. У метызнай вытворчасці будзе ўвасабляцца праект выпуску дроту для рэзкі крэмніевых пласцін.

**Сёлета БМЗ адзначыць 27 гадоў з моманту выпуску першай тоны беларускай сталі. За мінулы час на пячных агрэгатах і разлівачных машынах выплаўлена і разліта больш за 35 млн тон прыдатнай загатоўкі. Плаўка пад нумарам «324199», зробленая ДСП-3 у ноч з 19 на 20 чэрвеня 2011 года, адзначыла выпуск 35-мільённай тоны сталі.**

Буйныя праекты на заводзе рэалізуюць сумесна з замежнымі інвестарамі. Гэта выгадна не толькі на стадыі будаўніцтва новых аб'ектаў, але пры прасоўванні прадукцыі на рынкі збыту. Ужо да 2015 года на БМЗ плануюць выпускаць не менш чым тры мільёны тон сталі. Уся праграма мадэрнізацыі ацэньваецца ў больш чым 550 млн еўра. Частка праектаў будзе ўвасабляцца разам з заходнімі або расійскімі партнёрамі шляхам стварэння сумесных прадпрыемстваў. Галоўнае — быць наперадзе кітайцаў і не адставаць ад еўрапейцаў.

***— Горадаўтваральнае прадпрыемства ніколі не заставалася ў баку ад сацыяльных запатрабаванняў сваіх рабочых, жыхароў рэгіёна...***

— Так, наша прадпрыемства не толькі развіваецца, але і нясе адказнасць за тую зямлю, на якой мы жывём. Таму мы працягваем вырашаць экалагічныя задачы рэгіёна. Адна з асноўных — увядзенне пыла- і газавыдалення на металургічных печах. Гэты праект пачнём рэалізоўваць вясной 2012 года. У яго завод укладае 17 млн еўра. За два наступныя гады мы значна паменшым экалагічную нагрузку на рэгіён.

Увогуле мы праводзім шмат мерапрыемстваў — культурных, спартыўных. Людзей важна зацікавіць і маральна, і матэрыяльна. Так, сярэдняя заработная плата за май склала 2 мільёны 860 тысяч рублёў.

У дамах, што раней былі інтэрнатамі, цяпер робім капітальны рамонт і з дазволу ўласніка жылля прадаём кватэры супрацоўнікам завода, якія знаходзяцца ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

За намі застаецца фінансаванне хакейнага клуба «Металург». Мы выдзелілі Br20 мільярдаў на будаўніцтва трэцяй чаргі цэнтра алімпійскага рэзерву. Асноўным падрадчыкам выступае Гомельскі аблвыканкам, а фінансаванне ідзе за кошт спонсарскіх сродкаў БМЗ. На першым этапе пабудавалі лядовы палац, алімпійскі басейн і аквапарк. Летась здалі вяслярную базу. Між імі ёсць свабодная прастора, дзе будзе зала гульнявых відаў спорту, другое трэніровачнае поле для маладых хакеістаў і фігурыстаў плюс адна з самых сучасных у Беларусі лыжа-ролерных трас.

**Журналісты пацікавіліся і тымі льготамі і гарантыямі, што маюць супрацоўнікі прадпрыемства. Старшыня прафсаюзнага камітэта БМЗ Аляксандр Каляда расказаў, што менавіта сёлета калектывам прыняты новы калектыўны дагавор:**

— Мы імкнуліся агаварыць у гэтым дакуменце ў тым ліку сацыяльныя пытанні. Прадугледжаны асобныя выплаты ад прадпрыемства і прафсаюзаў да свят, нараджэння дзяцей, у сувязі з уступленнем у шлюб, на пахаванне. Закупляем абанементы ў плавальны басейн, на хакейныя матчы. За ўдзел у мастацкай самадзейнасці ці спартыўных спаборніцтвах заахвочваем людзей матэрыяльна. Гэта аб'ядноўвае калектыў. Не забываем мы і пра ветэранаў завода. Непрацуючым пенсіянерам (а іх у нас 1260) са сродкаў завода даплачваем да пенсіі ад 60 да 100 тысяч рублёў. У нас добрая ветэранская арганізацыя, якая мае свой офіс у ДК металургаў. Там ветэранаў працы штомесяц ушаноўваюць з асабістымі святамі. Напярэдадні Дня металурга праводзім вялізную праграму не толькі для ветэранаў, але і для прадстаўнікоў працоўных дынастый — людзі ж павінны прыемна адпачываць. На правядзенне культурна-забаўляльных мерапрыемстваў па прафсаюзнай лініі летась мы патрацілі больш як 800 млн рублёў. Завод — яшчэ больш. Да таго ж прадпрыемства арганізоўвае дзіцячае аздараўленне ў лепшых санаторыях рэспублікі, якое бацькам абыходзіцца толькі ў 10 % ад кошту пуцёўкі: 90 % аплачвае завод. Добра працуе медсанчасць, робіцца ўсё, што неабходна з пункту гледжання стварэння бяспечных умоў працы для кожнага супрацоўніка БМЗ.

**НАШ АДРАС:**
**РУП «БМЗ», 247210**
**Гомельская вобласць,**
**г. Жлобін, вул. Прамысловая, 37.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*УНН 400074854.*



Міжнародная навукова-тэхнічная канферэнцыя «Метал-2011».

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.58 | 21.33 | 16.35 |
| Віцебск — | 4.40 | 21.30 | 16.50 |
| Магілёў — | 4.48 | 21.23 | 16.35 |
| Гомель — | 4.53 | 21.11 | 16.18 |
| Гродна — | 5.14 | 21.47 | 16.33 |
| Брэст — | 5.23 | 21.39 | 16.16 |

**Месяц**

*Поўня 15 ліпеня. Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

*Пр. Аляксандра, Анатоля, Васіля, Дзяміда, Івана, Канстанціна, Макея, Марка, Нікадзіма, Піліпа, Сцяпана.*
*К. Марыі, Бенядзікта, Сцяпана.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.






**Усходні гараскоп на наступны тыдзень**

# Дзевам варта засяродзіцца на асабістым жыцці, а Казярогі не павінны кідацца ў крайнасці

**АВЕН.** У поўнай меры давядзецца адчуць што «справе — час, пацесе — гадзіна», а зусім не наадварот. Што ж, паспрабуйце навучыцца атрымліваць задавальненне і ад працы. Вам можа спатрэбіцца эмацыйная разрадка. Не трымайце стрэс у сабе, паспрабуйце знайсці выхад пачуццям, але, пажадана, мірны. Вас чакае ўсведамленне каштоўнасці зносін з блізкім вам чалавекам.

**ЦЯЛЕЦ.** Пастарайцеся паспець адступіць перш, чым сур'ёзна пакрыўдзіце кагосьці, хто вам неабыякавы. Давядзецца кантраляваць сябе кожную секунду, каб не нагаварыць лішняга. Сканцэнтруйце ўсю сваю энергію на дасягненні асноўнай мэты, не трэба разменьвацца на дробязях. Любога роду кампрамісы толькі перашкодзяць. Калі атрымаецца захоўваць свой настрой стабільным на працягу тыдня — можаце лічыць гэта перамогай над уласнымі слабасцямі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень будзе гарманічны і спрыяльны для ўзаемаадносін. Аўторак і серада выдатныя дні для рамантычнай паездкі або пачатку вандроўкі. У пятніцу нечаканая сустрэча са старым каханнем можа ўскалыхнуць пачуцці, якія задрамалі. Не варта чакаць ад лёсу вельмі многага. Будзьце, па магчымасці, больш эгаістычныя і знайдзіце час, каб зрабіць сабе максімум прыемнага.

**РАК.** Развіццё падзей будзе шмат у чым залежаць ад вашых рашэнняў і дзеянняў. Калі вы дапусціце памылку — не хвалюйцеся, але лепш было б выправіць яе адразу. Субота і нядзеля — удалыя дні для сустрэч і спатканняў. Звыклы рытм жыцця будзе парушаны ўзнікненнем чагосьці нябыта малаважнага. Паспрабуйце быць максімальна спакойнымі, гэтая падзея, напэўна, не будзе мець іншых наступстваў, акрамя псавання вашага настрою.

**ЛЕЎ.** Панядзелак — добры дзень для пабудовы планаў адпачынку. У аўторак і сераду лепш не спрачацца з каханым чалавекам, нават на нейтральныя тэмы. Калі, вядома, вы лічыце каштоўнымі адносіны, якія склаліся. У нядзелю магчыма невялікая дарожная рамантычная прыгода. Магчыма, будзеце занадта доўга разважаць, спрабуючы прыняць абсалютна правільнае рашэнне. Без толку — логіка таксама не ўсёмагутная, практычна ўсякае рашэнне ўключае элемент інтуіцыі. У вас ёсць выбар: альбо вы аплакваеце ўпушчаныя магчымасці, альбо пачынаеце актыўныя пошукі новых.

**ДЗЕВА.** Не варта занадта гучна і радасна паведамляць аб сваіх дасягненнях навакольным. Можаце патрапіць у няёмкую сітуацыю. Не адсоўвайце на другі план асабістае жыццё, лічачы, што ў вас занадта шмат спраў. Наадварот, неабходна як мага больш мець зносіны, пераважна з тымі, хто вам даўно знаёмы, у ідэале — з тым, каго вы кахаеце і хто кахае вас. Паспрабуйце быць уважлівымі і клапатлівымі ў адносінах да партнёра.

**ШАЛІ.** Калі ў вас ёсць падобнае жаданне — прынясіце карысць грамадству. Якраз гэты выгляд дзейнасці зараз падыходзіць вам больш за ўсё. Не варта гарачыцца: можа так здарыцца, што ўсе вакол будуць супраць вас. Каханы чалавек можа выклікаць вас на адкрытую гутарку, каб усвядоміць усю сур'ёзнасць адносін. Перш чым казаць штосьці, падумайце.

**СКАРПІЁН.** Магчымая спрэчка з партнёрамі, прычым асноўная прычына крыецца ў вас. Будзеце схільныя да містыцызму. Абавязкова трэба правесці хоць некалькі гадзін на прыродзе. Можна не вельмі далёка. Не трэба прад'яўляць да каханага чалавека завышаныя патрабаванні: ён асоба, а не эталон. Выхадныя — добры час для прымірэння.

**СТРАЛЕЦ.** Паглядзіце на сябе збоку, выпраўце тое, што ў стане выправіць. Вам па сілах стварыць вакол сябе астравок кахання і гармоніі — дзе цярпеннем, а дзе ідучы на разумны кампраміс. Магчыма, давядзецца ад чагосьці адмовіцца і аднекуль сысці. Выхадныя спрыяльныя для сустрэч і спатканняў.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень ідэальны для планавай дзейнасці, якая прынясе маральнае задавальненне. З'явіцца магчымасць скласці вельмі выгадную для вас дамову. Выберыце правільную тактыку дзеянняў у асабістым жыцці: ніякіх крайнасцяў і ўскладнення адносін. Надайце каханаму чалавеку больш увагі.

**ВАДАЛЕЙ.** Не вельмі засяроджвайцеся на сваё адлюстраванне, вы можаце быць асляплены ўласным ззяннем. Застаецца толькі паспагадаць людзям, якія побач з вамі. Магчымы ўдалы паварот падзей у асабістым жыцці. Неразуменне і крыўды пачнуць адыходзіць, і вы зноў адчуеце шчасце. Удалымі для сустрэч і зносін з каханым будуць аўторак, серада і пятніца.

**РЫБЫ.** Будзеце выклікаць павышаную цікавасць у прадстаўнікоў процілеглага полу. У аўторак і сераду пастарайцеся не праяўляць гневу у адносінах да каханага чалавека, бо гэта можа адштурхнуць яго ад вас. Займіцеся чым-небудзь новым — тым, што вы ніколі не рабілі. Атрымаеце ад гэтага велізарнае задавальненне. Адзінай праблемай можа стаць рэакцыя блізкіх на вашы паводзіны.

## БУЛЬБА

**«Як не будзе на Макрэні (1 жніўня) дажджу, то не будзе бульба гнісці ў зямлі» — вялікую ўвагу ў гэты дзень надавалі бульбе.**

**Бульба адносна нядаўна з'явілася на тэрыторыі жыхарства ўсходніх славян, прыкладна ў XVIII стагоддзі. Доўгі час яна лічылася «чужой», «д'ябальскай» раслінай. У стараверскіх тэкстах бульбу, чай і табак называлі «антыхрыставымі» раслінамі. І толькі ў XIX стагоддзі бульбу сталі ўжываць у ежу, спазнаўшы яе смакавыя і нават лекавыя якасці. З тых часоў бульба ва ўсходніх славян стала «другім хлебам»: «Бульба хлебу дапамога», «Людзі на бульбе і капусце жывуць».**

- У нашых продкаў калісьці быў такі звычай: пасля заканчэння першага дня ўборкі бульбы на полі раскладвалі вогнішча і пяклі бульбу новага ўраджаю. Лічылася, калі пагрэць рукі аб гарачую бульбіну, яны не будуць мерзнуць узімку.
- У некаторых рэгіёнах пры заканчэнні збору бульбы пяклі бульбяныя бліны з морквай. На Палессі ў гэты дзень да святочнага стала абавязкова рэзалі пеўня.
- Паўсюдна было прынята крыху бульбы пакідаць на полі — каб задобрыць бульбянага бога — анчутку-бульбяніка.
- У народзе існавала строгае правіла: пачынаць капаць і есці бульбу неабходна ў той дзень тыдня, на які прыпала ў гэтым годзе Дабравешчанне.
- Акрамя гэтага, дапушчальным днём для пачатку капання бульбы лічылася субота — дзень ушанавання продкаў.
- Засыпаць бульбу ў склеп на доўгачасовае захоўванне раілі ў той дзень, калі памерлі бацька ці маці: «каб яны спрыялі з таго свету». Або ў той дзень тыдня, на які ў гэтым годзе прыпадала Дабравешчанне.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся

**Хлопчык страціў веру ў логіку пасля таго, як на пчальніку яго ўкусіла каза.**

☺

— Сёма, ты калі апошні раз у оперным тэатры быў?
— Калі банкамат шукаў.
— А што глядзеў?
— Нейкія дурныя пытанні задаеш! Зразумела ж: колькі грошай на рахунку засталося.

☺

**Вартаўнік склада біжутэрыі жыве вельмі бедна, але надта прыгожа.**

☺

У рэстаране.
— Афіцыянт, у мяне ў супе нешта плавае!
— Разумееце, гэта суп. Там заўсёды нешта плавае.
— Так, але ж яно кролем плыве і хвалю гоніць!

☺

**Адсутнасць валасоў на галаве мужчыны — гэта дадатковая плошча для пацалункаў!**



## СХАВАЛА

Прынёс зарплату і перадаў грошы жонцы, якая перабірала на кухні маліну.

Праз хвілін дзесяць жонка села за камп'ютар, пачала набіраць тэкст і сказала: «А куды я грошы паклала? Паглядзі на кухні».

На кухонным стале стаяла міска з малінай, а грошай не было.

— Паглядзі ў шуфлядзе над сталом, — падказала жонка.

І там іх не было.

— Зірні ў касметычку пад люстэркам.

У касметычцы было шмат markdown рознай драбязы, але і там зарплаты не было.

Жонка адышла ад камп'ютара і пачала заглядваць у розныя патаемныя, вядомыя толькі ёй, месцы: у кут канапы, у швейную машынку, пад сурвэтку, на якой стаяла ваза...

Атмасфера стала нервовай. Аднойчы жонка схавала фамільнае золата. Зняла пярсцёнак, завушніцы, ланцужок... і схавала да лепшых часоў, бо палічыла, што на агародзе золата не так блішчыць. Схавала і забылася куды.

Толькі праз сем гадоў, калі рабілі ў кватэры рамонт, я выпадкова знайшоў скрыначку, у якой ляжалі тыя пярсцёнак, ланцужок... І вось грошы.

— Дзе яны могуць прапасці? Знойдуцца, — супакойвала сябе і мяне жонка.

— Праз сем гадоў знойдуцца, — пагадзіўся я, і тут жонка ўспыхнула.

— Гэта я ва ўсім вінавата! Я — на кухні, я — друкую, я — грады палю. А ты што робіш? Ты толькі...

Тут жонка паклала руку на сэрца, села на канапу і... дастала з ліфчыка грошы.

— Каб не ты, то... — у голасе жонкі пачуліся радасныя ноткі.

— Вядома ж, я!

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



| № предмета аукциона | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| 88. | Асфальтированная площадка в зоне отдыха водохранилища «Комсомольское озеро» (парк Победы), местоположение в соответствии с экспликацией зоны отдыха – Площадка № 20. Для размещения объекта, функционирующего в весенне-осенний период (установка надувных аттракционов, прокат электромобилей), архитектурная форма – переносной аттракцион.* | 20,0 | 700 |
| | **УП «Минскзеленстрой», тел. 255-13-56, 255-15-01** | | |
| 89. | Территория Лошицкого усадебно-паркового комплекса, специфическое сооружение, площадка № 2. Для осуществления розничной торговли прохладительными напитками, мороженым и сладостями. | 15,0 | 525 |
| 90. | Территория Лошицкого усадебно-паркового комплекса, специфическое сооружение, площадка № 1. Для оказания услуг по нанесению аквагрима. | 2,0 | 70 |
| | **УП «Партизанское», тел. 255-13-56, 255-15-01** | | |
| 91. | Ул. Стебенева, 2, административно-хозяйственное здание, требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис). | 15,9 | 558 |
| 92. | Ул. Стебенева, 2, административно-хозяйственное здание, требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис). | 13,8 | 483 |
| 93. | Ул. Стебенева, 2, административно-хозяйственное здание, требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис). | 59,3 | 2 080 |
| 94. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех солений и квашений), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 12,6 | 441 |
| 95. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех солений и квашений), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 15,7 | 550 |
| 96. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех солений и квашений), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 33,6 | 1 180 |
| 97. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех солений и квашений), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 24,0 | 840 |
| 98. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех солений и квашений), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 21,9 | 770 |
| 99. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов (проходная), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 42,3 | 1 485 |
| 100. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 7,9 | 277 |
| 101. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 119,3 | 4 190 |
| 102. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 349,8 | 12 300 |
| 103. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 382,4 | 13 400 |
| 104. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 283,3 | 9 950 |
| 105. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 150,0 | 5 250 |
| 106. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 536,5 | 9 400 |
| 107. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 574,8 | 10 100 |
| 108. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 430,0 | 15 100 |
| 109. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 396,1 | 13 900 |
| 110. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (фруктохранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под склад, склад оптовой торговли. | 726,3 | 12 770 |
| 111. | Ул. Стебенева, 2, административно-хозяйственное здание, требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис). | 16,0 | 560 |
| 112. | Ул. Стебенева, 2, административно-хозяйственное здание, требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис). | 19,7 | 690 |
| 113. | Ул. Стебенева, 2, административно-хозяйственное здание, требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис). | 26,5 | 930 |
| 114. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (засолочный цех), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 193,6 | 6 800 |
| 115. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (засолочный цех), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 255,1 | 8 930 |
| 116. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (засолочный цех), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 253,5 | 8 880 |
| 117. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (служебное), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 60,8 | 2 130 |
| 118. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех №6), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 332,3 | 11 680 |
| 119. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех №6), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 342,1 | 12 000 |
| 120. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех №6), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 348,1 | 12 200 |
| 121. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (цех №6), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 345,6 | 12 100 |
| 122. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, (проходная), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под производственное использование, склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 42,3 | 1 485 |
| 123. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (засолочный цех), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 154,7 | 5 440 |
| 124. | Ул. Стебенева, 2, здание спецскладов, торговых баз, хранилищ (овощехранилище), требуется ремонт, отсутствует отопление. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. До сноса. | 366,3 | 12 850 |
| 125. | Ул. Андреевская, 28, здание склада (заглубленное), отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 822,9 | 14 450 |
| 126. | Ул. Андреевская, 28, склад, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 343,99 | 12 090 |
| 127. | Ул. Андреевская, 28, склад, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под склад, склад оптовой торговли. | 6,9 | 242 |
| 128. | Ул. Андреевская, 28, помещение склада, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 6,9 | 242 |
| 129. | Ул. Центральная, 46, здание спецскладов (склад №3), отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 55,4 | 1 940 |
| 130. | Ул. Центральная, 46, здание спецскладов (склад №3), отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 14,6 | 512 |
| 131. | Ул. Центральная, 46, здание спецскладов (склад №3), отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 21,6 | 758 |
| 132. | Ул. Центральная, 46, овощехранилище № 3 (заглубленное). Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 26,0 | 910 |
| 133. | Ул. Центральная, 46, помещение в административно-хозяйственном здании, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 13,4 | 469 |
| 134. | Ул. Центральная, 46, помещение в административно-хозяйственном здании, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 14,8 | 518 |
| 135. | Ул. Центральная, 46, помещение в административно-хозяйственном здании, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 9,5 | 334 |
| 136. | Ул. Центральная, 46, помещение в административно-хозяйственном здании, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 16,2 | 568 |
| 137. | Ул. Центральная, 46, помещение в административно-хозяйственном здании, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 16,1 | 565 |
| 138. | Ул. Центральная, 46, помещение в административно-хозяйственном здании, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 6,4 | 224 |
| 139. | Ул. Центральная, 46, помещение в административно-хозяйственном здании, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис). | 35,6 | 1 248 |
| 140. | Ул. К. Либкнехта, 43, склад, отсутствует отопление, водоснабжение, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис), склад, склад оптовой торговли. | 205,9 | 7 240 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Аукцион состоится **28 июля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются **с 18 по 26 июля 2011 г.** в рабочее время (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**

**Срок договора аренды по предметам аукциона с № 1-26 и с № 28-140 – 5 лет, по предмету аукциона № 27 – 10 лет с момента ввода здания в эксплуатацию.**

* Условия аукциона по предметам аукциона № 87 и № 88:

Победитель аукциона за счет собственных средств обязан:

- установить объект требуемой архитектурной формы и обеспечить его функционирование в соответствии с указанным функциональным назначением;
- обеспечить подключение объекта к источнику электроэнергии;
- установить контейнер и заключить договор со спецпредприятием на вывоз мусора;
- установить биотуалет (при необходимости);
- обеспечить подвод воды и канализации к объекту в соответствии с санитарными нормами и правилами (при необходимости);
- по завершении сезона произвести демонтаж объекта.

Согласование эскизного проектного предложения по конструкции и внешнему виду осуществляется победителем аукциона в установленном Мингорисполкомом порядке с комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома и отделом архитектуры и градостроительства администрации Центрального района г. Минска.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 17 марта 2011 г. № 690 продолжительность сезона в 2011 г. установлена с 15 апреля по 15 ноября (при благоприятных погодных условиях).

Во всех летних кафе обязательна реализация кваса в кегах в розлив и мороженого отечественного производства в ассортименте.

Со схемами размещения асфальтированных площадок можно ознакомиться у организатора аукциона либо в администрации Центрального района г. Минска (отдел архитектуры и градостроительства – тел. 306-42-95, отдел торговли и услуг – тел. 306-41-73).

****Условия аукциона по предметам аукциона с № 28 по № 32** *(для помещений № 212.1, 212.2, 212.3, 524.1 и 524.2)***:**

1. установление границ помещений путем размещения торгового оборудования или устройства временных перегородок из ГКЛ высотой 2,4 метра по границам арендуемой площади (при необходимости возможно устройство перфорированных решеток от перегородки до конструкции подвесного потолка);
2. размещение торгового оборудования выполнить согласно расчету путей эвакуации и согласовать с управлением по эксплуатации ТЦ «Столица»;
3. изменение объемно-планировочного решения помещений должно производиться согласно нормативным правовым актам Республики Беларусь с разработкой проектного решения;
4. технические условия на выполнение проектных работ по объемно-планировочному решению, электрооборудованию, инженерным сетям и т.п., выдаются по запросу арендаторов управлением по эксплуатации ТЦ «Столица».

*Дополнительные требования для помещений № 212.1, 212.2 и 212.3:*

учет электроэнергии осуществлять по одному из следующих вариантов:

- общий учет электроэнергии производить по существующим приборам учета (общим электросчетчикам, установленным в электрощите 2ВРУ-1Т (помещение № 212.1)), а расчет между арендаторами производить по фактически потребляемой (установленной) мощности;
- в каждом из помещений № 212.2 и 212.3 установить индивидуальный прибор учета электроэнергии с разработкой проектного решения.

*Дополнительные условия для помещения № 212.2:*

- устройство отдельной входной группы (дверного блока с пределом огнестойкости EI-45) в противопожарных витражах со стороны подземной улицы торгового центра.

*Дополнительные требования для помещений № 212.2 и 212.3:*

- установка отдельной группы выключателей с разработкой проектного решения (при необходимости осуществления управления освещением раздельно в каждом помещении).

*Дополнительные требования для помещений № 524.1 и 524.2:*

1. проведение проектных и строительно-монтажных работ по реконструкции помещений под объект розничной торговли непродовольственными товарами;
2. учет электроэнергии осуществлять по одному из следующих вариантов:

- общий учет электроэнергии производить по существующим приборам учета (общим электросчетчикам, установленным в электрощитовых № 3309 5ВРУ-БЛ-1 и № 3214 4РУ-ДЦ), а расчет между арендаторами производить по фактически потребляемой (установленной) мощности;
- в каждом из помещений № 524.1 и 524.2 установить индивидуальный прибор учета электроэнергии с разработкой проектного решения.

Все вышеперечисленные работы выполняются арендатором за счет собственных средств без дальнейшей компенсации расходов.

Для осмотра объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, необходимо в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, в рабочее время обращаться к арендодателям по телефонам, указанным в настоящем извещении. Организатор аукциона рекомендует участникам аукциона при осмотре объекта недвижимости уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам), а также соответствующий планируемому виду деятельности размер арендной платы.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в течение срока, установленного для приема документов для участия в аукционе, подает заявление на участие в торгах по установленной форме со следующими документами:

заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме;

копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, пр. Машерова, 80, код 153001369, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». **Задаток должен быть внесен до 17.30 26.07.2011;**

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования (паспорт, страницы 31, 33 и страница с регистрацией места жительства (пропиской));

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования (копии свидетельства о государственной регистрации и устава, при необходимости копию контракта с руководителем), документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (информационное письмо), документ о назначении руководителя;

иностранным гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность;

представителем иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

**При подаче документов** на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц **предъявляют документ**, удостоверяющий личность (паспорт).

При отсутствии у граждан, индивидуальных предпринимателей текущего (расчетного) счета, он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

В соответствии с Инструкцией о порядке сдачи в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 16.12.2009 № 271, договор аренды недвижимого имущества с победителем аукциона заключается на основании решения Мингорисполкома о сдаче в аренду этого имущества на пять лет в срок в соответствии с законодательством.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель оформляет в комиссию Мингорисполкома по упорядочению использования зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, заявление с просьбой согласовать сдачу недвижимого имущества в аренду и условия договора аренды. Заявление должно быть подписано арендодателем и победителем аукциона, а по объектам, находящимся в хозяйственном ведении ЖРЭО администраций районов г. Минска, согласовано с администрацией района г. Минска, на территории которого расположено недвижимое имущество.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель вправе до получения соответствующего решения Мингорисполкома заключить договор аренды в соответствии с законодательством на срок до 2 месяцев с тем субъектом хозяйствования, в отношении которого им направлено заявление о согласовании сдачи в аренду недвижимого имущества.

**Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by.**

